Супрацоўніцтва

НІКОЛІ БОЛЕЙ

У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўшанавалі памяць ахвяр Халакосту

Мерапрыемствы, прымеркаваныя да 75-годдзя вызвалення вязняў нацысцкага лагера Асвенцым і дня памяці ахвяр Халакосту, учора адбыліся ў Беларусі і па ўсім свеце. Арганізатарамі аднаго з іх выступілі Міністэрства замежных спраў нашай краіны і музей гісторыі ВАВ.

Фота БелТА.

Былая вязніца мінскага гета, старшыня дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Гілф» Фрыда РЭЙЗМАН падчас цырымоніі запальвання свечак.

Учора, у 15-ю гадавіну абвяшчэння Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту, галоўнае знешнепалітычнае ведамства краіны разам з шэрагам пасольстваў, якія акрэдытаваны ў Мінску, ўпершыню зладзілі мерапрыемства ў такім фармаце, расказаў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй ДАПКЮНАС.**

«Гэтае мерапрыемства не рытуальнае, яно мемарыяльнае, практычнае — памятаць пра тое, што чалавечнасць у сабе трэба захоўваць, гадаваць і ахоўваць кожны дзень, — падкрэсліў Андрэй Дапкюнас. — Мне здаецца, галоўны сэнс нашай памяці аб Халакосце — гэта наданне рэальнай сілы палітычнаму, маральнаму, чалавечаму закліку — «Ніколі болей».

Пра тое, што праявы антысемітызму знаходзяць месца і ў сучаснай сусветнай супольнасці і краіны павінны сумесна змагацца з імі, казалі ў сваіх прамовах Надзвычайныя і Паўнамоцныя Паслы: Расіі — Дзмітрый Мезенцаў, Ізраіля — Алон Шогам, Германіі — Манфрэд Хутэрэр, Часовы павераны ў справах ЗША Джэніфер Мур.

«Апошнія некалькі гадоў у ЗША і іншых краінах свету існуе трывожная тэндэнцыя росту антысемітызму, — заявіла **Джэніфер МУР.** — Акрамя таго, мы назіраем размыванне паняцця Халакосту, таму так важна, што беларускі ўрад праводзіць падобныя мерапрыемствы».

На мемарыяльнай падзеі прысутнічалі прадстаўнікі іншых дыпламатычных місій, органаў улады, грамадскіх аб'яднанняў, парламентарыі, ветэраны, нашчадкі Праведнікаў свету. Падчас падзеі адбылася цырымонія ўзнагароджання дыпломам і медалём ад пасольства Ізраіля Праведніка свету з Беларусі.

З нагоды памятнай даты ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрыліся часовыя музейныя экспазіцыі «Аўшвіц», «Вайна. Халакост. Памяць без тэрміну даўніны», «Люстэрка пакаленняў», прысвечаныя лёсам ахвяр нацызму.

Марыя ДАДАЛКА.

Дапамогі на дзяцей вырастуць

З 1 лютага ў нашай краіне павялічваецца памер дапамогі на дзяцей да 3 гадоў. Гэта звязана з ростам сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў за папярэдні квартал.

Памер дапамог складзе:
на першае дзіця — 405,48 рубля;
на другое і наступных дзяцей — 463,40 рубля;
на дзіця-інваліда ва ўзросце да 3 гадоў — 521,33 рубля.

Як паведамляюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, гэтыя памеры дапамог будуць дзейнічаць да 31 ліпеня ўключна.

Святлана БУСЬКО.

ЯСКРАВАЯ ПЕРАМОГА ПРЫГАЖУНЬ

Жаночая зборная Беларусі па індор-хакеі выйграла чэмпіянат Еўропы

У фінальным паядынку нашы дзяўчаты абыгралі галоўных фаварытаў турніру каманду Нідэрландаў у серыі булітаў з лікам 4:3, асноўны час матча скончыўся з лікам 1:1. Гераіняй дня стала Марына Нікіціна, якая спачатку зраўняла лік у фінале, а пазней у серыі булітаў зрабіла вырашальны штрафны кідок.

Фота БелТА.

Гэтая перамога стала першай для нашых хакеістак, якія займаюць цяпер трэцяе месца ў сусветным рэйтынгу (апярэджваюць беларусак зборныя Нідэрландаў і Германіі). Нагадаем, раней жаночая нацыянальная зборная Беларусі па індор-хакеі была двухразовым прызёрам чэмпіянатаў Еўропы: у 2016 і 2018 гадах дзяўчаты заваявалі бронзавыя ўзнагароды, у 2018-м наша каманда заняла таксама трэцяе месца на Кубку свету.

Адзначым, што чэмпіянат Еўропы з'яўляецца другім па значнасці пасля Кубка свету турнірам. Ен стаў адборачным да сусветнага першынства 2021 года, куды адправіцца шэсць найлепшых камандаў Старога Свету.

З перамогай нашу зборную павіншаваў Прэзідэнт.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Да 75-годдзя Перамогі

ЗОРНЫ ПАХОД ЗАВІТАЎ У АСІПОВІЧЫ

Сёння, 28 студзеня, тут сустракаюць удзельнікаў вядомай патрыятычнай акцыі, якія наведваюць месцы баявой славы

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка праводзіць гэты паход ужо 55-ы раз. Зорным ён называецца таму, што на карце яго схема нагадвае зорку.

Сёлета ў паходзе бяруць удзел таксама студэнты з Расіі (прадстаўнікі Маскоўскага і Новасібірскага дзяржаўных педуніверсітэтаў і Расійскага дзяржаўнага прафесійна-педагагічнага ўніверсітэта), Казахстана (Еўразійскі нацыянальны ўніверсітэт імя Л. Гумілёва), Узбекістана (Ташкенцкі педуніверсітэт імя Нізамі), Туркменістана і КНР. З 28 да 31 студзеня больш чым 270 студэнтаў і выкладчыкаў наведаюць дзевяць раёнаў на тэрыторыі Мінскай, Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Адзін з атрадаў па традыцыі пабывае ў Асіповіцкім раёне.

— Для нас вельмі ганарова прымаць такіх гасцей, — адзначыла намеснік старшыні Асіповіцкага райвыканкама Ганна Землянухіна. — Па-першае, студэнты на месцы знаёмяцца з гісторыяй Беларусі, наведваюць памятныя мясціны. Па-другое, яны маюць зносіны непасрэдна са школьнікамі, паказваюць ім сваю прафарыентацыйную праграму. Госці расказваюць, якія патрабаванні існуюць да тых, хто вучыцца ва ўніверсітэце, наколькі гэта прэстыжна. Школьнікі, у сваю чаргу, паказваюць свае культурныя праграмы. Наогул Зорны паход — вельмі карысная справа як для студэнтаў, так і для нашых школьнікаў, якія ў перспектыве могуць стаць педагогамі.

Сустрэча пачнецца з мітынгу на цэнтральнай алеі горада, а потым гасцей запросяць у гісторыка-краязнаўчы музей. На працягу чатырох дзён моладзь і іх выкладчыкі будуць сустракацца са школьнікамі, воінамі-інтэрнацыяналістамі, ветэранамі Вялікай Айчыннай, удзельнічаць у мітынгах, прысвечаных памяці тых, хто загінуў падчас вайны, выступаць з канцэртамі, арганізуюць майстар-класы і спартыўныя спаборніцтвы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Надвор'е

МОКРЫ СНЕГ РАЗГУЛЯЕЦЦА

А бліжэй да выхадных будзе чарговая адліга і плюс 7-8 градусаў

Зноў сіноптыкі абяцаюць няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам на 4—8 градусаў вышэйшым за кліматычную норму. У сярэдзіне тыдня магутны цыклон прынясе слату і непагадзь, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Калі заўтра раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца невялікі дожджык, то бліжэй да сярэдзіны дня ў асобных раёнах прагназуюцца ўжо моцныя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Месцамі слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад 3 марозу да 3 цяпла. Няўтульнае надвор'е застанецца ў нас і ў чацвер. У гэты дзень часам чакаюцца ападкі, у асноўным мокры снег, уначы і раніцай у асобных раёнах будуць моцныя ападкі і наліпанне мокрага снегу. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла. Удзень прагназуецца ад 2 марозу да плюс 4 градусаў.

Мокры снег з дажджом будуць чаргавацца і на працягу сутак у пятніцу. Месцамі чакаюцца туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень — ад 2 марозу да 5 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні надвор'е будуць вызначаць франтальныя раздзелы і цёплыя паветраныя масы атлантычнага паходжання. Так, у суботу ўначы месцамі, раніцай і ўдзень — на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах чакаецца туман, уначы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 7 градусаў. У нядзелю надвор'е абяцаюць як у пачатку вясны. У другі дзень лютага ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Уначы месцамі будзе туман. Тэмпература паветра ўначы — ад нуля да плюс 5 градусаў, удзень — 2—8 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Святыні

Ікона свяціцеля Савы Сербскага ў асвячоным храме

Урачыста і велічна прайшло асвячэнне дамавога храма Барысаўскага епархіяльнага ўпраўлення ў гонар свяціцеля Савы, першага архіепіскапа Сербскага. Ганаровае месца ў гэтым невялікім светлым храме заняла ікона святога Савы, якую перад пачаткам богаслужэння перадалі ў дар па блаславенні Патрыярха Сербскага Ірынея. Пасля малебну архіпастыр Сербскай праваслаўнай царквы епіскап Маравіцкі Антоній таксама паднёс у дар храму камплект літургічных сасудаў.

Абраз з выявай свяціцеля — гэта дакладная копія фрэскі з манастыра Мілешава, створанай у гонар 800-годдзя Сербскай праваслаўнай царквы.

Шанаванне святога Савы на Белай Русі мае глыбокія гістарычныя карані. Гэтага свяціцеля згадвае Францыск Скарына ў календары «Малой падарожнай кніжыцы» (1522) у ліку самых значных славянскіх святых, а Захарыя Капысценскі ў сваім трактаце «Паліноды» (1621) называе яго ўзорам для пераймання.

— Для епіскапскага служэння ў сучасных умовах асабліва важныя не толькі прыклад вялікага святога Савы, але і яго нябеснае заступніцтва і дапамога, якія будуць асабліва адчувальныя, калі яму будуць прыносіцца пастаянныя малітвы ў асвячоным храме ў яго гонар, — лічаць у прэс-службе епархіі.

— Прыклад святога Савы, плады яго падзвіжніцкай і духоўна-асветніцкай дзейнасці не абмяжоўваліся межамі святой гары Афон і Сербіі. Яны аказалі істотны ўплыў на ўвесь праваслаўны свет ад Грэцыі да Маскоўскай Русі. Шанаванне святога на тэрыторыі сучаснай Беларусі зацвердзілася ў XV—XVI стагоддзі, — расказаў **епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі ВЕНІЯМІН.**

Богаслужэбныя песнапенні на сербскай мове выканаў дзіцячы хор кафедральнага сабора Уваскрэсення Хрыстова горада Барысава пад кіраўніцтвам рэгента Ксеніі Качаноўскай. Пропаведзь перад прычасцем прачытаў свяшчэннік Ігар Васько.

На богаслужэнні прысутнічаў і маліўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Велько Кавачавіч. Як адзначыў ён, асвячэнне прастола дамавога храма ў гонар святога Савы Сербскага стала яшчэ адным унёскам ва ўмацаванне духоўнага адзінства двух праваслаўных народаў. Гэта асабліва значна цяпер, калі паміж Сербіяй і Беларуссю імкліва развіваюцца палітычныя і эканамічныя стасункі. Такія мерапрыемствы сведчаць пра тое, што нашы краіны не толькі развіваюць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, але і з'яўляюцца братэрскімі.

Епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін падзякаваў епіскапу Антонію за архіпастырскі візіт і ў памяць аб сумеснай малітве паднёс ікону Ефрасінні Полацкай. Ён таксама ўдастоіў архіерэйскіх грамат беларускага прафесара Івана Чароту і сербскага праваслаўнага публіцыста Ранка Гойкавіча, які браў удзел у верасні ў Дні беларускага пісьменства і друку і які прывёз у дар ад Сербскай Патрыярхіі ікону святога Савы.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.